«Где мой край», 1988 и др.). В подобных живописных работах каждый исторический персонаж находится в своем пространстве и времени, однако идея произведения объединяет их воедино.

**Заключение**. Сосредоточенность на исторической памяти, традициях, проблемах пространства, времени, его течении, смещении временных и пространственных координат, соотношении предмета и среды – так или иначе повлияли на способы отображения художественного пространства и времени в произведениях белорусской станковой живописи 1960-х – 1991-го года. Поиски и эксперименты художников значительно обогатили творческую палитру отечественного искусства.

1. Чайковская, М. К проблеме пространственно-временных моделей в искусстве / М. Чайковская // Искусство. – 1980. - № 8. – с. 42.

## НАРОДНАЯ ЭСТЭТЫКА І АЎТАБІЯГРАФІЗМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ Ф.Л. МАКСІМАВА

*Л.У. Вакар*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Віцебскі майстар Ф.Л. Максімаў (1914–2006) з'яўляецца класікам народнай культуры ды інсітнай творчасці Беларусі ХХ стагоддзя. Шматлікія пластычныя і жывапісныя творы майстра з'явіліся ў выніку пераадолення выпрабаванняў лёсу і адначасова іх мастацкага пераасэнсавання праз архетыповыя вобразы. Мастакоўскі вопыт крэатыўнай дзейнасці, адкрыццё ў творчасці духоўных ісцін надае творчасці Ф.Л. Максімава ўзорны характар. Яго творы ўспрымаюцца як споведзь цэлага пакалення, трагічны лёс якога падзяліў майстар. У 2001 годзе яму было прысвоена званне "Народны майстар Беларусі".

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз творчасці Ф.Л. Максімава, раскрыццё яго значнасці для гісторыі мастацтва Беларусі ХХ ст.

**Матэрыял і метады.** Матэрыяламі для дадзенага артыкула з'яўляюцца творы Ф.Л. Максімава з музеяў і прыватных калекцый, а таксама публікацыі па яго творчасці. У якасці метадалогіі скарыстаны біяграфічны, іканаграфічны, семантычны і фармальна-стылістычны аналізы.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. Нарадзіўся Хведар Лазаравіч Максімаў на хутары пад Віцебскам і большую частку жыцця не займаўся творчасцю. У 1960-х гадах працаваў у цэху сувенірнай вытворчасці ПА "Хімпласт", дзе стаў рабіць падзелкі з аргшклу, дрэва, гіпса, мармура. У 1969 годзе напісаў першую карціну. З 1983 года Максімаў прымаў актыўны ўдзел у выставах народнай творчасці. З'яўляецца Лаўрэатам Усесаюзнага агляду самадзейнай мастацкай творчасці (1984-85), II Усесаюзнага фестываля народнай творчасці (1987), Рэспубліканскай выставы народнага мастацтва (1989), I і II Нацыянальнай выстаўкі інсітнага мастацтва (1994, 2000), I Фестываля народнага мастацтва Беларусі «Беларусь – мая песня» (1998). У 1992 годзе студыя «Белвідэацэнтр» здымае пра Х.Максімава кароткаметражны фільм «Майстар з Віцебска». У 1997 годзе прыняў удзел у Міжнароднай выставе «Insita-97» (Браціслава, Славакія). Работы Х.Л. Максімава знаходзяцца ў фондах ДУ Віцебскі АМЦНТ", УК "Віцебскі абласны краязнаўчы музей, "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь", Музея народнага мастацтва ў Атрэнбусах (Польша), Дзяржаўнага музея-запаведніка «Царыцына» (Расія), Расійскага Дзяржаўнага Дома народнай творчасці (Москва). Творы Ф.Л. Максімава дэманстраваліся на 6 Нацыянальных выставаўках мастацтва «Insitus» (1994, 2000, 2008, 2012, 2016, 2020) [1; 5]

Так склалася, што творчасць стала для яго адзіным выйсцем з ўсіх бедаў і нялітасцяў лёсу. У юнацтве ён перажыў раскулачванне і зруйнаванне сядзібы свайго бацькі. Трагедыя страты ўласнага свету, якую зведаў Максімаў, стала яго першым вопытам экзістэнцыйнага кшталту. У сваім жыцці ён не раз трапляў у сітуацыі, калі яму прыходзілася перажываць адчужанне сябе ад свету. Кожны раз апору ён знаходзіў ў сябе. Усе складанасці яго жыцця можна прама альбо ўскосна прасачыць у творах [2].

Большасць твораў Максімава нясуць народны вобраз ідылічнага, казачнага свету. Жыццё на хутары сярод прыроды, побыт вяскоўца, фальклорныя і гратэскна-сатырычныя матывы. Макеты хутароў арганічна дапаўняюць мадэлі прыладаў працы, постаці сялян, занятых рознымі рамёствамі. Паэтызацыя сялянскай працы і ладу жыцця ўласціва для ўсіх яго прац этнаграфічнага характару: “Жанчына са ступай” (1985), “Мужык з жорнамі”(1986), “Беларуска” (1987), “Распілоўка лесу” (1987), “Рамеснікі” (1989). Некаторыя кампазіцыі складзены з дэталяў, зробленых у розны час, і на першы погляд успрымаюцца як механічна аб'яднаныя. Пэўна, майстар паступова матэрыялізоўваў свае разрозненныя ўспаміны мінулага, складаючы з іх карціны вясковага жыцця. Кампазіцыя “Сялянская сям'я” (1974-1985) складзена з аб'ёмаў печкі, пралкі, і постацей людзей. Гаспадыня завіхаецца каля печкі, стары побач лапці пляце, і прыгажуня дзяўчына ў вянку непадалёк прадзе кудзелю.

Вялікая колькасць работ майстра мае гістарычную праблематыку. У іх аўтар распрацоўвае вобраз ідэалізаванага народнага героя. Гэта франтальна выяўленыя постаці з уласцівай ідэаграфічнасцю формы. Майстар увасабляе ў аб’ёме першасныя ідэаграмы, плоскасныя і схематызаваныя. Скульптуры “Усеслаў Полацкі”, “Ефрасіння Полацкая”, “Язэп Драздовіч”, “Андрэй Рублёў” – дэманструюць узоры народнай рэдукцыі партрэтнай іканаграфіі дзеячоў гісторыі і культуры. У работах творцы выразна выяўляецца народнае мысленне. Апавядальны сюжэт спалучаецца з умоўнасцю ідэаграфічных вобразаў. Даволі паказальнай для разумення псіхалогіі творчасці з’яўляецца гісторыя стварэння невялічкай кампазіцыі з мармуру, якая завецца “Помнік бацьку” (1974-76). У 1944 годзе бацька патрапіў пад бамбардзіроўку і загінуў. Месца яго захавання невядома. Каб выканаць свой сыноўі абавязак, зрабіў майстар твор, які імітуе помнік над магілай. Невялікі макет быў пастаўлены на куту кватэры, каб засведчыць любоў і ўдзячнасць сына. Тыпалагічна гэты твор набліжаецца да сармацкага надмагілля, тут таксама прысутнічае ўзвышаная ідэалізацыя і пэўны элемент культавага шанавання роду.

Асобная група твораў мае вельмі адметную пластыку. У іх няма арыентаванай на глядача франтальнасці. Кампазіцыйныя пошукі скіраваны на мадэліраванне, пластычнае аднаўленне жыццёвай сітуацыі. Як і першыя кампазіцыі, работы маюць макетападобны характар. Абіраецца кропка агляду зверху, акцэнты пераносяцца на гарызантальную плоскасць. Узорнымі работамі гэтай групы твораў з’яўляюцца творы: “Шчаслівая маці”, “Заходняя Дзвіна, Віцьба, Лучоса” (1987). Апошняя кампазіцыя з’уляецца пераходнай працай паміж макетамі і круглай скульптурай. Яна ўяўляе сабой лодку з чатырма казачнымі вобразамі. Яны мацуюцца па-асобку ў аб’ёме лодкі, і дапаўняюць яе сілуэт загадкавымі выявамі каралевен, жонападобнага стварэння з крыламі і рыб’ім хвастом. Паралельна з пошукамі выяўленчага вобраза склалася легенда пра тры ракі, на берагах якіх стаіць Віцебск. Менавіта іх супольную плынь ўвасобіў майстар у вобразе лодкі ды ў выявах каралевен. Сюжэт легенды і яго пластычнае рашэнне напоўненны міфічным светаадчуваннем.[3, 44]

Жывапіс Максімава мае амаль усе асноўныя характарыстыкі, што і скульптура: архетыповасць ідэаграм, міфалагізм светапогляду. Большасць з іх краявіды. “Дзявочыя выспа”, “Сядзіба”, “Хутар млынара”, “Закінуты хутар” уяўляюць розныя варыяцыі сядзіб у атачэнні дрэў. Магутныя дрэвы ў жывапісу Максімава з’яўляюцца самым

ёмістым светапоглядным вобразам, нагадваючым архетыповы сімвал “Дрэва жыцця”. Паступова ён набывае касмаганічныя рысы. У апошніх краявідах “Прыдзвінне”, “Ластаўкі”, “Плынь жыцця” магутныя дрэвы ўтвараюць цесную сцяну лесу, якая выцягваецца ўздоўж ракі альбо затуляе сабой жытло чалавека. Кампазіцыя будуецца пастрочна, паралельна плоскасці ліста. Тры ярусы – неба, зямля, рака – утвараюць традыцыйную схему архаічнай мадэлі свету.

Да лепшых узораў мастацкага асэнсавання сацыяльна-гістарычных і эканамічных трагедый XX стагоддзя адносяцца карціны “Байкальская расшчыліна. Уцёкі з Гулагу”, “Цяшкі і доўгі шлях да храма праз 70 разбуральных гадоў”. У даволі драматычнай рабоце “Ясны дзень на спаленай зямлі” (1989) жыццёсцвярджальнасць бярэ перавагу. З чорнай зямлі паўсталі тры велічныя сасны і сваімі кронамі закрылі дзве сіметрычна намаляваныя хаты. Іх выразны сілуэт чытаецца на фоне жоўтага сонечнага неба. Кампазіцыя мае строгую сіметрыю. Створаны вобраз высокага мастацкага абагульнення ўспрымаецца як класічны ўзор народнай культуры. Вытлумачваючы свой твор, Максімаў сказаў: “Наша зямля спалена хіміяй, атамам, але сонца ўсё роўна свеціць. Прыйдзе час, і на ёй зноў заквітнеюць краскі”. [4, 228; 5]

Апошнія работы Максімава адзначаны выпавядальнасцю і пачуццём замірэння з лёсам. Іх тэматыка рэлігійна-духоўная. Гэта шматлікія анёлы з кветкамі, крыжамі, трубамі. “Укленчаная”, “Анёлы над Успенскім саборам”, “Трубячыя анёлы”, “Крыж Ефрасінні”.

**Заключэнне.** Творчасць Хведара Максімава – узор адметнага мастакоўскага бачання свету. Жыццёвы шлях майстра прайшоў праз жахі і пакуты XX стагоддзя, яго творчы шлях – праз іх пераадольванне і ачышчэнне трагедыяй, праз катарсіс.


1. Вакар, Л. [уступ. арт.; уклад.] Каталог выставы мастацтва insitus "Талент шчырага сэрца" / Абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. – Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1992. – 44 с.

2. Вакар, Л. [уступ. арт.; уклад.] Каталог выстаўкі. Фёдар Максімаў / Віцебскі абласны навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці. – Віцебск: Друк. імя Камінтэрна, 1994. – 30 с.

3. Лабачэўская, В. Інсіта / В. Лабачэўская // Мастацтва. – 1994. – № 5. – С. 37-49.

4. Вакар, Л. У. Мастацтва insita: з гісторыі правядзення выставак непрафесійнага мастацтва / Л. У. Вакар [і інш.] – Мінск: СтройМедиаПроект, 2013. – 304 с.: іл.

5. Кудрэйка Надзея. Колеры лета ў позняй восені. Інсітнае мастацтва як фальклор нашых дзён / Культура - № 46 (1486) - 14.11.2020 - 20.11.2020 г. – С. 12-13.


## ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ ОСОБЕННОСТИ ДИОРАМЫ НАЧАЛА XIX ВЕКА


*А.А. Варган*

*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*


На сегодняшний день наблюдается возрождение интереса зрителя к искусству диорамы, о чем свидетельствуют создание новых и реконструкция уже существовавших произведений, а также публикации статей и научных исследований, посвященных данной тематике. Рассматривая ретроспективу данного вида искусства, можно отметить, что диорамы претерпели колоссальные изменения в своем конструктиве и подаче материала. Искусствоведческие словари и энциклопедические справочники определяют данный вид искусства как лентообразную живописную картину с предметным передним планом. Однако такое толкование характерно преимущественно для диорам XX века.

Целью данного исследования является определение диорамы как вида искусства на этапе его зарождения, выявление художественных особенностей диорамы начала XIX века.

**Материал и методы.** Материалами для данного исследования послужили научные статьи и описания работ основоположника диорамного искусства Луи Жака Манде